**Анатацыя**
да магістарскай дысертацыі
**“Нестандартныя аналітычныя жанры ў кантэксце сучаснай газеты”**
магістранткі спецыяльнасці “Журналістыка” 1-23 80 05
**Семянюк Крысціны Алегаўны**

У даследаванні К.А. Семянюк праведзена сістэматызацыя класіфікацыі нестандартных жанраў друкаваных СМІ, а таксама выяўлены асаблівасці функцыянавання тэкстаў у нетыповых жанравых мадэлях на старонках выданняў Беларусі рознага ўзроўню – рэспубліканскай газеты “Республика”, абласнога выдання “Заря” і рэгіянальнай газеты “Вечерний Брест”.

Аўтар працы прадставіла розныя падыходы да нестандартных жанраў у тэорыі журналістыкі. К.А. Семянюк аргументавана прыводзіць і сваё меркаванне на існуючыя жанраствальныя паказчыкі нестандартных аналітычных жанравых мадэляў тэкстаў. Магістрант вызначае віды аналітычных нестандартных жанраў, зафіксаваных на старонках газет “Республика”, “Заря” і “Вечерний Брест” за 2016 год. На канкрэтным практычным матэрыяле выяўлены і прадстаўлены дадатковыя жанраствальныя крытэрыі нестандартных тэкстаў.

Праца ўключае тры дадаткі, якія маюць важную практычную вартасць.

Палажэнні магістарскай працы, сабраны фактычны матэрыял могуць быць выкарыстаны пры далейшым вывучэнні нестандартных жанраў, а таксама пры выкладанні некаторых дысцыплін па журналістыцы, падчас падрыхтоўкі спецкурсаў, спецсемінараў.